БАЦЬКАЎШЧЫНА

WHITERUTHENIAN WEEKLY „THE FATHERLAND“ Цана 30 н. фэн.

№ 27 (30) 12 ВЕРАСЬНЯ 1948 Г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 2

КРЫЗЫС ЗАВАСТРАЕЦЦА

БЭРЛІНСКАЕ ПЫТАНЬНЕ НА ПЕРШЫМ ПЛЯНЕ

Справа савецкае блякады Бэрліну й немагчымасьць дайсьці да паразуменьня ў гэтым пытаньні й надалей стаіць на першым пляне сусьветнае палітыкі. Як мы ўжо паведамлялі, 31.8.48 у Бэрліне пачаліся нарады губэрнатараў 4-ох гаспадарстваў, што акупуюць Нямеччыну. Нарады, будучыя фактычным узнаўленьнем Кантрольнай Рады, што перад чатырма месяцамі самазьліквідавалася з прычын дэманстрацыйнага выхаду з паседжаньня прадстаўніка СССР маршала Сакалоўскага, пачаліся ў выніку бліжэй няведамых пагадненьняў на маскоўскай канфэрэнцыі й мелі прывесьці да зьняцьця савецкай блякады Бэрліну. Узамен за гэта заходнія гаспадарствы мелі згадзіцца на ўвядзеньне ў Бэрліне ўсходняй савецкай маркі, якая аднак знаходзілася-б пад кантроляй 4-ох гаспадарстваў.

Многія заходнія палітыкі й абсэрватары ўважалі гэтыя нарады за пачатак адпружаньня ў Бэрлінскім канфлікце, аднак дагэтуль да нічога канкрэтнага яны не прывялі. Апошняе сёмае паседжаньне 4-ох губэрнатараў адбылося 7 верасня бязь ніякіх вынікаў. Генэрал Клей падаў да ведама, што нарады магчыма будуць прадаўжацца, аднак тэрмін іхнага ўзнаўленьня яшчэ не ўстаноўлены.

Прэзыдэнт Труман склікаў у справе Бэрлінскага канфлікту 7.9.48 спэцыяльнае паседжаньне Амэрыканскай Нацыянальнай Рады Бясьпекі, якая была ўстаноўленая ў 1947 г. для каардынаваньня нутраной, вонкавай і ваеннай палітыкі. У паседжаньні прынялі ўдзел міністар замежных справаў Маршал, Міністар абароны Форэстэль і дзяржаўныя сакратары ўсіх родаў зброі.

Афіцыйныя амэрыканскія й брытанскія камэнтатары зьвяртаюць увагу на тое. што сытуацыя ёсьць вельмі паважная.

Трэба дадаць, што савецкія ўлады Бэрліну й надалей падбухторваюць нямецкіх камуністых да дэманстрацыяў і выкліканьня хаосу. Гэтак яны ўжо трэйці раз сарвалі паседжаньне гарадзкой рады Бэрліну. Паліцыя савецкай зоны, ня гледзячы на запэўненьні ейнага начальніка, ня толькі ня прыняла мераў супраць беспарадкаў, але й памагала разагітаванай таўпе ўварвацца ў будынак Бэрлінскага Магістрату. Дзеля гэтага паседжаньне гарадзкой рады Бэрліну 7.9.48 адбывалася ў брытанскай зоне гораду. Апошняй савецкай правакацыяй было арыштаваньне многіх журналістых і 19 нямецкіх паліцыянтаў заходніх зонаў Бэрліну, якога даканала нямецкая паліцыя савецкай зоны супольна з савецкай ваеннай паліцыяй. У гэтай справе францускія акупацыйныя ўлады злажылі савецкім уладам пратэст.

Нямецкае насельніцтва Бэрліну моцна ўстрывожана гэтымі падзеямі й адначасна выказвае сваё абурэньне супраць актаў тэрору з боку камуністых. Яно наважана змагацца за свабоду навет у тым выпадку, калі яшчэ большыя спаткаюць яго труднасьці й ахвяры.

Не абходзіцца й без закідаў і крытыкі заходніх гаспадарстваў за іхныя пасыўныя захоўваньні ў дачыненьні да Бэрлінскіх выпадкаў. Гэтак «Сацыял-дэмакрат» — орган найсільнейшай у Бэрліне партыі — піша: «Тое, што адбываецца ў Бэрліне перад вачыма цэлага сьвету, зьяўляецца вялікай трагэдыяй. Хаця заходнія дэмакратыі маюць усе магчымасьці шырокага ўплыву на дэмакратычныя элемэнты за зялезнай заслонай, каб такім чынам разваліць усходні блёк, гэтага яны аднак ня робяць. Не хватае ім адвагі ўсе гэтыя магчымасьці выкарыстаць, таксама, як іхныя папярэднікі не маглі адважыцца зьліквідаваць гітлераўскай сыстэмы, пакуль гэта дарогай дыпляматычнай акцыі было магчыма. Яны заяўляюць, што зробяць усё магчымае, каб захаваць сусьветны мір. Але ў запраўднасьці робяць усё тое, каб павялічыць бяду».

ЗАЯВА ПРЭЗЫДЭНТА ТРУМАНА

Прэзыдэнт Труман на прэсавай канфэрэнцыі 9.9.48 заявіў, што ў справе Бэрліну амэрыканцы ня будуць нараджацца з саветамі пад націскам зь іхнага боку, а апошнія захоўваньні савецкіх уладаў і інсьпіраваных імі нямецкіх камуністых былі гэтым націскам. Аднак Амэрыка ў ніякім выпадку не зрачэцца сваіх правоў да Бэрліна.

ВЯЛІКАЯ ЧЫСТКА Ў ПОЛЬШЧЫ

Выканаўчы Камітэт камуністычнай Польскай Работніцкай Партыі зьняў ведамага польскага камуністага й заступніка прэм'ера Уладыслава Гамулку із становішча генэральнага сакратара партыі й назначыў на яго месца прэзыдэнта Польшчы Балеслава Берута.

У камунікаце з 5.9.48 афіцыяльна было пададзена з Варшавы, што прэзыдэнт Берут і міністар гандлю й прамысловасьці Гіляры Мінц дамагаліся ў выканаўчым камітэце ліквідацыі «нацыяналістых і правых элемэнтаў», якія тармазілі плян сацыялізацыі сельскае гаспадаркі. Гамулку закідаецца, што ён салідарызаваўся із становішчам камуністычнай партыі Югаславіі супраць камінформу і дамагаўся пайсьці на пагадненьне зь югаславянскімі камуністымі.

Далей сказана ў камунікаце, што неабходна грунтоўна праверыць усіх сяброў польскай камуністычнай партыі, сярод якіх пашырыліся фальшывыя разуменьні марксізму. Некаторыя кіруючыя дзейнікі партыі адыйшлі ад генэральнай лініі й «скапітулявалі перад чужымі ўплывамі». Аднак партыя перажыве гэты крызыс — гаворыцца ў камунікаце — бо яна мае моцную апору ў Маскве.

Згодна камунікату, Гамулка прызнаўся да памылак і ў сваей «самакрытыцы заявіў, што ён ужо зрэвідаваў сваё фальшывае становішча, якое ён перад гэтым займаў».

Некаторыя заграНічныя карэспандэнты ўважаюць, што ў Польшчы каля палавіны ўсіх камуністых не згаджаецца з палітыкай камінформу. Іхная апазыцыя ў першу чаргу накіраваная супраць дамаганьня камінформу правесьці калектывізацыю сельскае гаспадаркі.

На 6 верасьня былі вызваны ў Варшаву акруговыя кіраўнікі Польскай Работніцкай Партыі для абмеркаваньня партыйнага крызысу.

ЭЎРАПЭЙСКІ КАНГРЭС У ІНТЭРЛЯКЭНЕ

Ад 1 да 5 верасня ў швайцарскім горадзе Інтэрлякэне адбываўся эўрапэйскі кангрэс дзеля стварэньня агульнаэўрапэйскага парляманту — задзіночаных штатаў Эўропы. Побач зь іншымі гаспадарствамі ад Пірынэяў аж да зялезнай заслоны на кангрэсе была гэтым разам заступлена й Нямеччына.

НЕМЦЫ САЛІДАРЫЗУЮЦЦА З ЗАХАДАМ

9.9.48 у Бэрліне ў знак пратэсту супраць савецкай блякады адбылася масавая дэманстрацыя немцаў, у якой узяло ўдзел чэцьверць мільёна чалавек. На мітынгу перад Райхстагам лідар сацыял-дэмакратычнай партыі Нэйман прызваў хвілінным маўчаньнем ушанаваць тых, што мучыліся й загінулі ў гітлераўскіх концлягерах, як і тых, што мучацца й гінуць цяпер у савецкіх концлягерах.

У ЧЭХАСЛАВАЧЧЫНЕ НЕСПАКОЙНА

Былы чэхаславацкі прэм'ер міністраў Др. П. Цэнкль паінфармаваў — згодна паведамленьня А. П. зь Лёндану — што ў Камуністычнай Партыі Чэхаславаччыны праводзіцца вялікая чыстка. Бальшыня насельніцтва краю выказвае няскрыванае прызнаньне адвазе Тыто, якую ён праявіў у змаганьні з камінформам.

Згодна апошніх паведамленьняў, 7.9.48 чэхаславацкі ўрад абвесьціў «закон аб абароне народна-дэмакратычнай рэспублікі», а так-жа ў сувязі з гэтым закон аб устанаўленьні дзяржаўнага надзвычайнага суду.

ФРАНЦЫЯ БЯЗ УРАДУ

Выкліканы сацыялістымі францускі ўрадавы крызыс трывае й далей. Створаны зь вялікімі труднасьцямі ўрад Шумана, які быў адзінаццатым урадам ад часу вызваленьня Францыі з паднямецкае акупацыі, праіснаваў толькі 64 гадзіны. Посьле таго, як францускі парлямант 295 галасамі супраць 289 адкінуў задэкляраваную Шуманам праграму ягонага ўраду, апошні ў сераду ноччу злажыў на рукі прэзыдэнта сваю дымісію.

Як паведамляў Рэйтар, палітычныя абсэрватары ўважаюць, што адзіным выхадам з урадавага крызысу ёсьць стварэньне кааліцыйнага ўраду нацыянальнай уніі пачынаючы ад скрайна правых партыяў і канчаючы сацыялістымі, аднак за выключэньнем камуністых.

Прэзыдэнт Орыёль, посьле нарадаў з прадстаўнікамі партыяў, запрапанаваў стварыць урад радыкалу Кэй.

Наагул існуюць вялікія труднасьці ў кірунку стварэньня ў сучасных умовах урадавай кааліцыі. Пры цяперашнім напружаным міжнародным палажэньні, калі трэба спадзявацца ўсякіх нечаканасьцяў таксама й для Францыі, такая сытуацыя ёсьць навет грознай.

Палітычныя абсэрватары ўважаюць, што калі ня ўдасца перамагчы цяперашняга ўрадавага крызысу, то трэба паважна лічыцца з магчымасьцю роспуску францускага парляманту і з аб'яўленьнем дыктатуры де Голя, які здабывае што раз большае значэньне й папулярнасьць.

Чытайце, пашырайце й выпісвайце адзіную беларускую газэту на эміграцыі — «БАЦЬКАЎШЧЫНУ!».

ПАЧЫНАЮЧЫ ШКОЛЬНЫ ГОД

У гэтым месяцы начынаецца навучаньне ў пачатковых і сярэдніх беларускіх школах на эміграцыі ў лягерах Д. П. Гэты факт зьяўляецца няштодзенным зьявішчам у нашым эміграцыйным жыцьці. Дык ня лішнім будзе тут над ім коратка спыніцца.

Якое вялікае значэньне мае родная школа для выхаваньня маладога пакаленьня, даказваць няма патрэбы. Гэтае значэньне школы было вялізарнае на бацькаўшчыне, але на чужыне яно ў шмат разоў большае.

Дык ня дзіва, што й змаганьне за школу, за ўплывы на ўзгадаваньне й вырабленьне характару прышлых людзкіх пакаленьняў таксама вялікае. Яно асабліва вядзецца паміж хрысьціянствам, як рэпрэзэнтантам ідэалістычнага сьветапагляду, і грубым камуністычным матэрыялізмам. Але гэтае змаганьне адбываецца й паміж паасобнымі нацыянальнасьцямі, якія — зусім натуральна — імкнуцца выхаваць сваю моладзь у духу нацыянальных патрэбаў грамадзянства, прыкладаюць усе свае сілы, каб дзякуючы школе сталася яна ў будучыні ўзорам грамадзянаў свае бацькаўшчыны.

На Беларусі, як ведама, школа рэдка калі адыйгрывала нацыянальную ўзгадавальную ролю ў кірунку натуральных і прыродных патрэбаў беларускага народу. Школа — гэтая магутная кузьня людзкіх характараў — была ў нас найчасьцей чужая з нацыянальнага гледзішча і служыла чужым нацыянальным інтарэсам. Калі возьмем пэрыяд часу паміж першай і другой сусьветнай вайной, дык у Ўсходняй Беларусі была яна найчасьцей расейскай, або беларускай толькі з гледзішча формы, а сваім зьместам і кірункам узгадаваньня старалася прышчапіць нашай моладзі чужыя й варожыя нам ідэі інтэрнацыяналізму й русафільства. У Заходняй Беларусі школьніцтва ўсіх тыпаў — ад пачатковых школаў да ўнівэрсытэтаў уключна — было зброяй палянізацыі.

Ня гледзячы на гэта, чужая школа на бацькаўшчыне ня ў сілах была выкараніць з душаў нашае моладзі нацыянальна беларускага характару й зрабіць яе глухой на імкненьні беларускага народу. Гэтая моладзь жыла ўвесь час у беларускім асяродзьдзі, знаходзілася пад непераможным уплывам здаровай сялянскай традыцыі, дзякуючы чаму чужанацыянальны ўплыў школы ня быў вельмі загрозьлівым. Прыкладам у Заходняй Беларусі найчасьцей спатыкаліся такія зьявішчы, што моладзь, набываючы ў школе патрэбную веду, актыўна й сьведама баранілася перад палянізацыяй і стыхійна бунтавалася супраць дэнацыяналізацыі.

Але ў зусім іншых абставінах знаходзіцца вялікая частка нашае моладзі на эміграцыі.

Тыя беларускія перамяшчэнцы, што жывуць у сваіх лягерах ці ў большых нацыянальных і адпаведна зарганізаваных беларускіх групах, маюць больш менш спрыяльныя ўмовы навучаньня сваіх дзяцей у беларускай школе.

Але горш прадстаўляецца справа з тымі, што жывуць меншымі групамі, часта зусім незарганізаваныя ў чужых лягерах, дзе няма беларускіх школаў і дзе дзеці нашыя змушаны наведваць школы польскія, украінскія ці расейскія. Тут нашыя дзеці могуць лёгка асыміляваца, тым больш, што і ўплыў асяродзьдзя ў гэтых лягерах чужы. А гэта — трэба прызнацца — вялікая для нас страта з нацыянальнага гледзішча, а таму нашыя арганізацыі й нацыянальны актыў павінны належна паклапаціцца, каб і гэтай моладзьзю заапякавацца й забясьпечыць, прынамсі часткава навучаньне беларускае мовы, літаратуры, гісторыі, геаграфіі Беларусі ды наагул даць ёй элемэнтарныя веды аб бацькаўшчыне.

Справа нашага беларускага школьніцтва на чужыне зьяўляецца наагул справай першараднага значэньня, хоць нашае грамадзянства, часта занятае бытавымі й іншыя клопатамі, не заўсёды сабе здае з гэтага справу. Аднак пытаньнем школьнага навучаньня й узгадаваньня нашае моладзі нам неабходна больш энэргічна заняцца.

На гэтым адрэзку нашае нацыянальна-грамадзкае працы нам трэба ў першую чаргу: 1. лепш зарганізаваць і паставіць на вышэйшым навучальным і ўзгадавальным узроўні ўжо існуючыя нашыя пачаткавыя й сярэднія школы ў Нямеччыне і 2. забясьпечыць навучаньне беларусаведы ў тых беларускіх групах, дзе няма беларускіх школаў і дзе нашыя дзеці наведваюць школы чужыя.

Спасярод існуючых школаў ёсьць такія, дзе навучаньне й узгадаваньне, ня гледзячы на недахоп школьных падручнікаў і агульныя лягерныя ўмовы, не заўсёды спрыяльныя для школьнае працы, пастаўлена беззаганна. Доказам гэтага могуць служыць факты, што моладзь такіх школаў вядзе сябе прыкладна ў жыцьці грамадзкім і асабістым, а абітурыенты некато-

І Ў БАЎГАРЫІ ПРЫХІЛЬНІКІ ТЫТО

У кіраўнічых колах баўгарскай камуністычнай Работніцкай Партыі паўсталі войстрыя разыходжаньні ў справе абвінавачаньня камінформам маршала Тыто. Баўгарскі міністар замежных справаў прабаваў зрабіць націск нашэфа баўгарскага ўраду Дымітрава, каб той вызваліўся з пад уплываў камінформу.

Белградзкая газэта «Борба» паведамляе аб разыходжаньнях паміж македонскім Таварыствам Культуры й Выхаваньня й баўгарскай Камуністычнай Партыяй. Македонцы, што жывуць у паўдзённа-заходняй частцы Баўгарыі, абвінавачваюць партыю ў тым, што яна імкнецца збаўгарызаваць македонскае насельніцтва, і прызнаюць заслугі Тыто ў вабароне македонскіх нацыянальных інтарэсаў. Далей македонцы абвінавачваюць камуністычную партыю ў тым, што яна разьвязвае нацыянальныя праблемы Баўгарыі ня так, як гэта зроблена Ленінам і Сталінам у Савецкім Саюзе (!?).

АМЭРЫКА БАРОНІЦЦА ПЕРАД КАМУНІСТЫМІ

Падкамісія палаты рэпрэзэнтантаў, якая змагаецца з процідзяржаўнай дзейнасьцю грамадзян, выступіла з праектам закону, які перадбачвае выціснуць усіх камуністых з амэрыканскіх урадаў. Згодна гэтага закону, камуністыя мусілі-б мэльдавацца ў паліцыі й не атрымлівалі-б пашпартоў.

Асабліва камісія дамагаецца: 1. Абмежаваць колькасьць заграніічных камуністых, што легальна прабываюць у ЗША. 2. Урад павінен даваць кангрэсу ўсе інфармацыі й тайныя акты, на аснове якіх можна праверыць ляяльнасьць кажнага ўрадаўца. 3. Павінны быць завостраныя кары для тых, што абыякава адносяцца да кангрэсу. Кажны дзяржаўны ўрадавец, што адмаўляецца даваць паказаньні, павінен быць зьняты із свайго становішча.

На думку камісіі, яшчэ сяньня ў урадавым апараце дзеяць шпіёнскія групы.

БРЫТАНСКА-АМЭРЫКАНСКІЯ МАНЭЎРЫ

Першы раз пасьля заканчэньня вайны адбудуцца супольныя брытанска-амэрыканскія ваенныя манэўры ў ваколіцах Нюрнбэргу ў Нямеччыне ад 8 да 18 верасьня. 1.200 асоб брытанскай лётніцкай дывізіі, якая была сфармаваная ў Палестыне, возьмуць удзел у манэўрах. Брытанцы сфарсуюць на аўтамабілях 800 кілёмэтраў дарогі з Шлезвіг-Гольштайну да Нюрнбэргу і такім чынам правядуць тактычныя ваенна-транспартныя практыкаваньні.

рых сярэдніх школаў, як прыкладам беларускай гімназіі імя Янкі Купалы ў Міхэльсдорфе, лёгка паступаюць у нямецкія ўнівэрсытэты й пасьпяхова там здабываюць вышэйшую асьвету. Але побач з такімі школамі, дзе, дзякуючы ахварнасьці й пэдагагічнаму прыгатаваньню настаўнікаў, справа пастаўлена на належнай вышыні, існуюць і школы, якія з гледзішча навучальнага й узгадавальнага пастаўлены наагул нізка. А ня выключаныя й зусім недапушчальныя ў школьнай практыцы выпадкі, калі распалітыкаванае лягернае кіраўніцтва стараецца выкарыстоўваць школу для сваіх палітычных экспэрымэнтаў, што груба пярэчаць элемэнтарным вымаганьням пэдагогікі.

Гэткі сумны выпадак меў, нажаль, месца ў мінулым годзе ў беларускім лягеры ў Ватэнштэце, дзе лягерная адміністрацыя давяла да звальненьня й выдаленьня зь лягеру заслужаных і кваліфікаваных настаўнікаў гімназіі, замяніўшы іх людзьмі непрыгатаванымі, а навет і зусім прыпадковымі з гледзішча іхнае пэдагагічнае кваліфікацыі. Зарубежніцкае лягернае кіраўніцтва ў Міхэльсдорфе зусім нядаўна арганізавала спробу такога-ж пагрому гімназіі імя Янкі Купалы, якая аднак спаткалася із станоўкім адпорам з боку лягернага жыхарства.

Вось-жа ў такіх і ім падобных выпадках нашае грамадзянства павінна быць заўсёды сьведамае вялікае ролі нашага беларускага школьніцтва, старацца ўтрымаць яго на адпаведнай нацыянальнай і навучальнай вышыні ды імкнуцца захаваць перад усякімі варожымі спробамі выкарыстаньня яго для вузкай палітычнай ігры. Беларускі Нацыянальны Камітэт, Школьныя Інспэктары, Згуртаваньне Беларускіх Настаўнікаў на Эміграцыі й сьведамае грамадзянства наагул павінны ўсьцяж трымаць руку на пульсе нашага школьніцтва й рупіцца аб ягоным пасьпяховым разьвіцьці.

У галіне ўзгадавальнае працы ў школе адыгрывае не малую ролю арганізацыя беларускіх скаўтаў, якая дзеля гэтага павінна спаткацца з большым і цяплейшым падтрыманьнем і апекаю з боку грамадзкіх дзейнікаў.

Што тычыцца навучаньня беларускай граматы й нацыянальнага ўзгадаваньня тэй нашай моладзі, што ў сілу канечнасьці змушаная наведваць чужыя школы, то тут справа ўжо цяжэйшая, але не безнадзейная. Заўсёды можна дагаварыцца з кіраўніцтвам такой школы ці лягеру, а ў выпадку патрэбы зь мясцовай суб-арыяй IPO, каб для беларускіх дзяцей данае школы ў рамах агульнае школьнае праграмы былі адведзеныя гадзіны для выкладаньня беларусаведы. Ня трэба таксама пакідаць думкі й об пазашкольным навучаньні пабеларуску там, дзе пры школе зарганізаваць гэтага ня ўдасца.

Такім чынам у сувязі з пачаткам новага школьнага году адкрываюцца перад адпаведнымі беларускімі арганізацыямі й наагул грамадзянствам новыя актуальныя заданьні й новыя адрэзкі працы. А гэтыя заданьні зьяўляюцца так важнымі, а праца над іх ажыцьцяўленьнем магчымая й ня вельмі цяжкая, што было-б незыбачальнай нашай вінай, калі-б мы ў гэтым кірунку нічога не рабілі.

ЦІ ГАТОВЫЯ САВЕТЫ ДА ВАЙНЫ?

Упалітычных колах сьвету дыскутуецца пытаньне: ці дойдзе да вайны із Савецкім Саюзам, ці ўдасца разьвязаць сяньняшнюю напружаную палітычную сытуацыю шляхам дыпляматычных перамоваў і пагадненьняў?

На гэтаю тэму асабліва многа пішацца ў амэрыканскай прэсе. Цэлы рад выдатных журналістых, апіраючыся на амэрыканскія й заграніічныя крыніцы, старацца выявіць ваенны й гаспадарскі патэнцыял Саветаў у параўнаньні із патэнцыялам ЗША, каб зрабіць вывад, ці на падставе вынікаў гэтага параўнаньня Савецкі Саюз можа распачаць вайну, ці не.

Гэтым пытаньнем спэцыяльна заняўся ведамы амэрыканскі журналісты Г. Тэйлер, які ў вапошнім нумары часапісу «Рыджэр Дайджыст» падсумаваў вынікі разважаньняў на гэтую тэму. Ён пачынае свае разважаньні тым, што Савецкі Саюз зьяўляецца больш чым 40 разоў больш за Нямеччыну, у гаспадарскіх дачыненьнях стаіць аднак на вельмі нізкім узроўні й недастаткова выкарыстоўвае свае гаспадарскія магчымасьці. Каб пракарміць 192 мільёны сваіх жыхароў, апрацоўваецца ў Савецкім Саюзе прыблізна такая-ж колькасьць зямлі, што й у ЗША, якія аднак патрабуюць пракармліваць толькі 142 мільёны людзей. Сельска-гаспадарчая прадукцыя Саветаў усьцяж падае ў вадваротнай прапорцыі да ўзросту насельніцтва. Таму Саветы заўсёды зьяўляюцца галодным краем.

Далей закранае Тэйлер прамысловы ўзровень СССР. Зазначае, што найважнейшыя прамысловыя цэнтры знаходзяцца ў трыкутніку Ленінград—Украіна—Цэнтральны Сібір, які ў вялікай меры зьяўляецца зруйнаваным. Агульны прамысловы ўзровень Саветаў не дасягнаў яшчэ амэрыканскага з пачатку бягучага стагодзьдзя.

Упрача гэтага зьяўляецца Савецкі Саюз краінай, што дазнала найвялікшых ваенных зьнішчэньняў. Саветы страцілі ў выніку вайны 58% усіх чыгуначных уладжаньняў і матар'ялу, 44% свайго электрычнага патэнцыялу, 45% прадукцыі сталі, 55% прадукцыі вугля, адну чэцьверць усяго запасу быдла, мільёны жыльлёвых будынкаў, мастоў і іншых уладжаньняў.

Далей Тэйлер паклікаецца на мову Сталіна зь 9 лютага 1946, у якой савецкі дыктатар стараецца пераканаць насельніцтва аб патрэбе дасягненьня перадваеннага стану ў галіне сельскай гаспадаркі й прамысловасьці, каб потым гэтыя ўзровень падняць яшчэ вышэй.

Магчыма спатрэбіцца на гэта аж тры пяцігодкі, хоць Тэйлер сьцьвярджае, што ніводная пяцігодка дагэтуль фактычна выканана ня была. У сувязі з дамаганьнем Сталіна, каб да 1951 г. выпрадукоўваць 60 мільёнаў тонаў бэнзіны, Тэйлер заўважае, што гэткая гадавая прадукцыя ЗША была ўжо 28 год назад. Толькі ў 1947 г. выпрадукавала Амэрыка 270 мільёнаў тонаў бэнзіны.

Шведзкія інжынеры, што працавалі ў Саветах, цьвердзяць, што ў Савецкім Саюзе 30% усей вугальнай прадукцыі спальваюць адныя толькі паравозы. Далейшыя 30% ідуць на выпрадукаваньне электрычнай энэргіі. Такім чынам для індустрыі астаецца толькі 40%. Згодна заявы Сталіна, вугольная прадукцыя павінна да 1951 г. павялічыцца да 500 мільёнаў тонаў у год. Але вугольная прадукцыя ЗША дасягнула гэтага ўзроўню ўжо перад 30 гадамі. Сталін цьвердзіць, што ў канцы гэтай пяцігодкі Саветы будуць вырабляць 60 мільёнаў тон сталі ў год. Ведама аднак, што Амэрыка ўжо пасьля першай сусьветнай вайны вырабляла 50% больш. Саветам не стае шмат якое, важнае з ваеннага гледзішча, сыравіны, прыкладам гумы, тым больш, што сынтэтычны выраб собскай гумы знаходзіцца яшчэ ў пялёнках.

Вялізарныя цяжкасьці маюць Саветы і ў галіне транспарту. Іх даваенны гандлёвы танаж раўняўся аднаму мільёну тон, тады, калі такі-ж танаж мела й маленькая Швэцыя. Дзякуючы амэрыканскай ваеннай помачы, а так-жа пераняцьцю нямецкіх і італьянскіх караблёў гэты танаж у міжчасе падвоіўся. Апрача гэтага было перададзена Савецкаму Саюзу 175 японскіх караблёў. Вялікая тэрыторыя Савецкага Саюзу вымагае асаблівай колькасьці нутранога транспарту. Чыгуначная сетка зьяўляецца вельмі рэдкай, а таксама недастатковая колькасьць каналаў. Рэкі Савецкага Саюзу на працягу доўгіх зімовых месяцаў замярзаюць. Такім чынам 85% усіх тавараў мусіць транспартавацца чыгункай. Але навет у ўспомненым прамысловым трыкутніку чыгуначная сетка зьўляецца вельмі рэдкай. Увесь Савецкі Саюз мае звыш 57 тысячаў міляў чыгуначных ліній, тады, калі Амэрыка мае іх 226 тысяч міляў.

Цікавыя факты падае Тэйлер аб выкарыстоўваньні работніцкай сілы ў СССР. Прыкладам на электрастанцыі ў Камарове працуе 480 работнікаў, тады, калі адно такое амэрыканскае прадпрыемства з той самай вышыняй прадукцыі лёгка можа абыйсьціся 51 работнікам. У Савецкім Саюзе патрабуецца адзінацаць чалавек для выпрадукаваньня аднэй тысячы кілёватаў электрычнае энэргіі, а ў Амэрыцы дастаткова для гэтае мэты двух чалавек.

Нялепш прадстаўляецца справа і і ў вугольнай прамысловасьці. Калі ў ЗША 90% усіх шахцёрскіх работ выконваецца мэханізаваным спосабам, 60% вугля заладоўваецца мэханічна і толькі 4% работнікаў працуюць з лапатамі й кіркамі, то ў Савецкім Саюзе большая колькасьць вугля дабываецца ручным спосабам. Шведзкія інжынеры паведамляюць, што ў Данбасе да чатырох зьняволеных шахцёраў прыдзеленыя: адзін інжынер, адзін наглядальнік, адзін тэхнік і адзін палітычны камісар або ўзброены «ахраньнік». А колькасьць зьняволеных прымусовых работнікаў сяньня ў Савецкім Саюзе большая, чымсьці работнікаў вольных. Ня гледзячы на нязвычайна нізкі жыльлёвы ўзровень, 60% прамысловасьці Савецкага Саюзу працуе для ваенных патрэбаў, тады, калі ў ЗША для гэтае мэты працуе толькі 40%.

Напасьледак разважае Тэйлер аб тым, як далёка зайшлі Саветы ў працы над атомнай бомбай. Амэрыканскія спэцыялістыя пераканаыя, што савецкія вучоныя ўжо ведаюць галоўны працэс вырабу атомнае бомбы, хаця, праўдападобна, яшчэ ня маюць паняцьця, як яна ўзрываецца. Але найвялікшыя цяжкасьці ляжаць у тэхнічных уладжаньнях атамных фабрыкаў, бо, як ведама, амэрыканская атамная бомба зьяўляецца рэкордам вышыні скамплікаванай індустрыяльнай тэхнікі. Небясьпека радыёактыўнага дзеяньня вымагае абслугі людзей — робатаў. Некаторыя аддзелы фабрычных уладжаньняў павінны неабмежавана й бесьперарыўна працаваць бязь людзкой абслугі. У гэтай галіне знаходзяцца Саветы на 22 гады ззаду ад ЗША. У той час, калі Саветы патрапяць зрабіць першую атомную бомбу, амэрыканцы будуць мець іх такі запас, які зраўняецца з савецкай 18-гадовай прадукцыяй.

У канцы Тэйлер зазначае, што Саветы, дзякуючы спэцыфічным прыродным асаблівасьцям краіны, зьяўляюцца дастаткова моцнымі ў вабароне свае тэрыторыі, але зусім слабыя для таго, каб напасьці на Амэрыку. Найвялікшую небясьпеку бачыць Тэйлер у тым, што Саветы зьўляюцца асабліва здольнымі цераз свае пятыя калёны выклікаць у сьвеце неспакой і хаос. Саветы, здаючы сабе справу з магутнасьці ЗША, сяньня — на думку амэрыканскага карэспандэнта — вайны яшчэ ня хочаць, аднак усьцяж будуць імкнуцца пры помачы свае дэструкцыйнай дзейнасьці й стварэньня пагрозаў вайны змусіць Амэрыку да гаспадарчага самагубства.

Гэтак думае й разважае Тэйлер, паклікаючыся на сухія факты. Аднак і ў палітыцы не заўсёды лёгіка пануе. І таму многія іншыя палітычныя абсэрватары Амэрыкі паважна лічацца з фактам, што палажэньне ў сьвеце паважнае й напружанае і зусім неспадзявана можа давесьці да вайны.

Р.

НОВАЯ ТАЙНАЯ ПАЛІЦЫЯ Ў РУМЫНІІ

Згодна паведамленьня з Букарэшту, у Румыніі зарганізаваная апошнім часам новая тайная паліцыя пад назвай «Агульны Аддзел бясьпекі народу». Яе заданьнем ёсьць «захаваць дэмакратычныя здабыткі народу»

Ул. Русак.

ШТО ГАВАРЫЎ СП. ПРЭЗЫДЭНТ?*)

Я зусім згаджаюся із становішчам «Бацькаўшчыны» — не палемізаваць із пашквільнай «прэсай» нашых зарубежнікаў, але дзеля таго, што ходзіць тут аб перакручваньні словаў сп. Прэзыдэнта БНР, хачу зрабіць для сябе выключэньне.

У нумары 10 — 11 аднэй з рэкордных пашквільных лістовак зарубежнікаў "Беларускай Волі" спадаром С-н была сфантазьяваная на гэтулькі бессаромная выдумка аб словах спадара Прэзыдэнта БНР М. Абрамчыка, сказаных на сходзе ў лягеры Лютэнзэ ў Мітэнвальдзе, што я, як прысутны там, ніяк ня мог стрымаць, каб не забраць слова.

На зьмесьце пашквільнага артыкулу сп. С-н я ня буду затрымлівацца, бо спадзяюся, што яго даволі пашыралі самі зарубежнікі.

Але вось, як было ў запраўднасьці:

Найперш сп. Прэзыдэнт правёў у Лютэнзэ дзьве сходкі: першая адбылася з актывам лягеру, дзе прысутнічалі і ўсе актывістыя зарубежнікі. Другая сходка — для ўсіх беларусаў — жыхароў лягеру.

На першай сходцы — пасьля інфармацыяў сп. Прэзыдэнта аб нашай вонкавай і нутраной сытуацыі, якую ўсе выслухалі зь вялікім зацікаўленьнем — фюрэр зарубежніцкай лягеру Лютэнзэ сп. Шаўцоў Сымон (пэўне-ж той самы «С-н») выцягнуў з кішані блёкнодік і папрасіў сп. Прэзыдэнта дазволу паставіць яму 16 пытаньняў. Сп. Прэзыдэнт ахвотна згадзіўся.

На адчытаныя сп. Шаўцовым адным махам пытаньні сп. Прэзыдэнт потым па парадку адказваў гэтак:

1-ае пытаньне: Як Вы глядзіце на фірму БЦР?

Адказ сп. Прэзыдэнта: На фірму БЦР усе беларусы мусяць глядзець, як на фірму чужую, як на твор акупанта. Усе гэткія выдумкі, як: «Остлянд», «Генэральны Камісарыят Беларусі», «Гэбітскамісарыят», «Беларуская Цэнтральная Рада» былі выкамбінаваныя ў Бэрліне. БЦР была «ўканстытуаваная» генэралам нямецкай акупацыйнай паліцыі, аб чым ведае ўвесь сьвет, бо аб гэтым шырака пісалася ўва ўсей тагачаснай як беларускай, так і нямецкай прэсе, якую бяз усякіх цяжкасьцяў можна знайсьці й сяньня ды прачытаць. Людзі, якія намагаюцца сяньня абнавіць дзейнасьць БЦР і надаць ёй нейкую форму «дзяржаўнасьці», сьведама ці нясьведама, робяць услугу нашым ворагам і адыгрываюць ролю правакатараў беларускай вызвольнай справы. Нідзе ня чутна і ня бачна было ў сьвеце, каб якісь народ згадзіўся з назначэньнем сабе прэзыдэнта

*) Гэты артыкул зьяўляецца моцна спозьненым, бо гутарка сп. Прэзыдэнта БНР у лягеры Лютэнзэ ў Мітэнвальдзе, якая тут перадаецца, адбылася ў чырвені 1948 г. Аднак друкуем яго зь вялікай прыемнасьцю, бо ўсе высьвеньні й растлумачэньні важных праблемаў нашага грамадзкага й палітычнага жыцьця, што зласьціліся на тэму гэнае гутаркі, зьяўляюцца поўнасьцю актуальнымі й сяньня — **Рэд.**

СПРАВЫ ДП

ДЗЕСЯТАЯ ПРЭСАВАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ IPO

«Галоўная нашая мэта — дабрадзейнасьць дзеля папраўы цяжкага лёсу Д. П. і ўцекачоў — заявіў новы Дырэктар IPO на амэрыканскую зону сп. Э. Раен, зьвяртаючыся да прадстаўнікоў Д. П. — прэсы на канфэрэнцыі 8.9.48 г. ў Бад-Кісінген. Гэтае кароткае, але абнадзейваючае сьцьверджаньне было прынятае прысутнымі зь ціхой і глыбокай удзячнасьцю. Трэба прызнаць, што сама асоба новага Дырэктара IPO, як і ягоная цёплая прамова зрабілі на прысутных як найлепшае ўражаньне. Шырокія масы ўцекачоў, здаецца небеспадстаўна, — могуць спадзявацца, што цяжкая іхная доля знаходзіць ужо належнае зразуменьне й спагаду сярод кампэтэнтных дзейнікаў.

Праведзеная спадарыняй Фэдэр, часова выконваючай абавязкі шэфа аддзелу інфармацыі, канфэрэнцыя выясьніла, хоць не заўсёды дэфінітыўна, шмат пытаньняў нашае праблемы. Першым зь іх была справа адцягваньня з заработнае платы працуючых Д. П. сумы 70 марак месячна і чаму гэтае распараджэньне ўладаў мае дзеіць узад ад 1.7.48 г. З адказу сп. Вільямса (аддзел фінансаў) вынікае, што прычынаю фінансавых цяжкасьцяў ёсьць праведзеная ў Нямеччыне валютная рэформа, у сувязі зь якой ОМГУС — Бэрлін (Ваеннае Кіраўніцтва) дамагаўся скарачэньня штатаў або заработнай платы Д. П. Пасьля трохдзённых зацяжных дыскусыяў ў Бэрліне, у якіх прынялі ўдзел, побач із шматлікімі фінансавымі экспэртамі, генэральны сакратар IPO ў Жэнэве сп. Так, губэрнатар амэрыканскай зоны Нямеччыны генэрал Клей і інш., было прынятае скарачэньне заработнай платы на суму 70 марак у месяц, дзякуючы чаму магчыма будзе ўтрымаць штаты ў дасюлешняй вялічыні. Гэта азначае, што дзякуючы скарачэньню заработнай платы ня будзе скарачэньня штатаў. З гэтае сумы 70 марак адна частка (50 марак) пойдзе на аплату коштаў утрыманьня (харчы, памешканьне) і ўсіх іншых дабрадзействаў, якімі карыстаюцца Д. П. з боку IPO, а другая частка (20 м.) пойдзе на асобны фонд, які будзе скарыстаны дзеля культурна-асьветных і іншых патрэбаў тых-жа Д. П. З такім вырашэньнем гэтае справы Галоўная Гаспода IPO на амэрыканскую зону быццам ня зусім згаджаецца і свае закіды што да гэтае пастановы пераслала ўжо ў Бэрлін ды чакае адтуль канчатковага адказу.

Далей была парушана праблема Д. П.-студэнтаў, у прыватнасьці факт, што ў францускай і ангельскай зонах яны фактычна звольнены ад высокае сымэстрыяльнае аплаты (200 — 250 м.). Адказваючы на гэта, сп. Грыг сьцьвярджае, што ў францускай зоне ў запраўднасьці звальненьняў няма (!), а ў ангельскай зоне займаецца гэтым ваеннае кіраўніцтва. IPO ў Жэнэве справы гэтае дасюль не разьвязала. Выданае ў міжчасе распараджэньне дае малую магчымасць нясеньня дапамогі тым, хто студыюе прафэсіі, карысныя пры рэпатрыяцыі ці эміграцыі.

Далейшае пытаньне гучэла: Чаму вернікі Расейскай Зарубежнай Царквы змушаныя плаціць нямецкі касьцельны падатак і ці могуць быць звольненыя ад яго тыя зь іх, што жывуць у Д. П.-лягерах? Адказ: Абкладаньне падаткам вернікаў Р. З. Ц. праводзіцца немцамі згодна зь перадваенным пагадненьнем між нямецкім урадам і кіраўніцтвам Расейскай Зарубежнай Царквы. Як праўная спадчына нямецкае дзяржавы, справа гэтая можа быць выясьненая толькі зь немцамі.

Чаму тыя Д. П., што працуюць пры арыях, дастаюць большую плату за тых, што выконваюць тую-ж самую працу ў Д. П.-лягерах? Паводля сп. Браўды тут дзьве галоўныя прычыны: 1. хто працуе ў вялікім горадзе (Ортсгрупа 1), зарабляе больш, чымсьці ягоны калега па прафэсіі на правінцыі (Ортсгрупа II), 2. хто ёсьць адказны за шмат лягераў, мусіць і зарабляць больш, чым той, хто адказвае за адзін лягер.

Якія крокі прарабіла IPO, каб выкарыстаць дэклярасаную, Нацыянальнымі Камітэтамі дапамогу ў працы IPO?

У вадказе былі высьветлены наступныя факты: Галоўная Гаспода на амэрыканскую зону была пераслала ў ОМГУС — Бэрлін усе статуты нацыянальных камітэтаў на зацьверджаньне. Аднак ОМГУС палічыў сябе за некампэтэнтнага ў гэтай справе. Цяпер статуты высланыя ў Галоўную Гасподу Арміі ў Франкфурце. Незалежна ад таго, які гэта дасьць вынік, фактычнае прызнаньне нацыянальных камітэтаў ужо наступіла хоць-бы ў тым сэнсе, што адбываюцца частыя канфэрэнцыі з дэлегатамі гэтых камітэтаў у розных справах Д. П.

Якія пляны й намеры мае IPO ў дачыненьні да старых людзей сярод Д. П.? Аказваецца розных плянаў ёсьць шмат, але эміграцыя для іх пакуль што магчымая толькі пры сем'ях. Дапамогі спадзявацца магчыма ад Сусьветнае Царкоўнае Службы.

На ўсе пытаньні ў справе эміграцыі ў ЗША, быў дадзены кароткі адказ: пакуль што нічога канкрэтнага ня ведама. Сп. Карузі якраз сяньня прыбыў у Эўропу і будзе заўтра на скліканай у гэтай справе канфэрэнцыі ў Франкфурце.

ПРАФЭСІІ СЯРОД Д. П.

Інфармацыйная Цэнтраля Задзіночаных Нацыяў на Эўропу ў Жэнэве падае да ведама, што сярод жыхароў эўрапэйскіх лягераў Д. П., як мужчын, так і жанчын, знаходзяцца амаль усе катэгорыі розных прафэсыяў, пачынаючы ад дасьледавальнікаў атамнае энэргіі, а канчаючы на звычайных работніках.

Спасярод 625.000 Д. П., якія ў канцы сакавіка сёлета знаходзіліся пад апекай IPO, было 340.000 або 54% працаздольных. Астальныя 285.000 — гэта дзеці да 16 год, асобы звыш 65 год, маткі з малымі дзецьмі, асобы, што ў сувязі з эміграцыяй ці рэпатрыяцыяй знаходзіліся ў дарозе і не маглі быць абнятыя статыстыкай, ды вельмі малая колькасьць зацяжна хворых і калекаў.

Галоўныя групы прафэсіяў сярод працаздольных паводля агульнай колькасьці наступныя:

	мужч.	прац.	жанч.	прац.
Разам	**226.690**	100.0	**113.788**	100.0
Вольныя прафэсіі	28.970	12.8	14.577	12.8
Духавенства і гандлёвыя працаўнікі	11.289	5.0	9.644	8.5
Урадаўцы і канцэлярскія працаўнікі	6.313	2.8	20.136	17.7
Земляробы	57.351	25.3	18.613	16.3
Кваліфікаваныя работнікі	76.609	33.8	21.583	19.0
Няпоўна кваліфікаваныя работнікі	19.439	8.5	4.308	3.8
Іншыя	26.719	11.8	24.907	21.9

Гэтая-ж справаздача дзеліць усіх працаздольных на дзьве групы паводля іхнага веку: ад 16 да 45 і ад 45 да 65 год. Але ранейшая справаздача падае, што 87% усіх ДП, што знаходзяцца пад апекаю IPO, належыць да групы ніжэй 45 год.

Сярод вольных мужчынскіх прафэсіяў найчасцей спатыкаюцца наступныя: прафэсары і настаўнікі — 2.115, кантралёры і бугальтары — 1.950, аграномы — 1.423, юрыстыя — 1.283, лекары — 1.150, духоўнікі — 1.119, інжынеры — 1.089, лясныя інжынеры й тэхнікі — 1.021. Спасярод жанчын тут пераважна знаходзім: мэдыцынскіх сёстраў — 2.566, настаўніц — 2.110, бугальтарак — 1.042, дэнтыстак — 462, узгадавальніц — 460, лекарак — 459.

Цікавыя прыносіць вынікі далейшы перагляд жаночых прафэсіяў. Там мы знаходзім у не малой колькасьці жанчын у якасьці кандуктараў, пажарнікаў, паліцэйскіх, рыбакоў, паляўнічых, сьлёсараў, кавалёў, муляроў, каменшчыкаў, самалётных мэханікаў, маракоў, навет ладавальніц гармат і ўзрывальшчыц і ў якасьці шэрагу іншых мужчынскіх прафэсіяў. Гэта паказвае, што ступень эманцыпацыі жанчын і зраўнаньня іх з мужчынамі сярод ДП ёсьць нятолькі дастатковая, але й рэкордная.

якімсь генэралам чужой акупанцкай паліцыі, а тым больш паліцыі гітлероўскай, што мае ў сьвеце такую нядобрую «славу».

2-ое пытаньне: Што Вы скажыце аб 2-ім Усебеларускім Кангрэсе, які пацьвердзіў паўнамоцтвы 1-га Ўсебеларускага Кангрэсу?

Адказ сп. Прэзыдэнта: Ніякім чынам «Другога Кангрэсу» нельга назваць «усебеларускім». Праўдзівае яму імя — гэта нарада пакліканых сп. Астроўскім людзей. За нямецкай акупацыі такіх «нарадаў» адбылося аж 3. Першая такая «нарада» была арганізаваная немцамі цераз Ермачэнку ў травені 1942 г. Другая, праўда, трошкі меншая, адбылася ў Бэрліне з прывезенымі, быццам на экскурсію, беларускімі адміністратарамі. Вось-жа, каб быць пасьлядоўным як у сэнсе зьместу гэтых зьездаў, так і храналёгіі, — «зьезд» сп. Астроўскага трэба назваць ня «2-ім Кангрэсам», але — «3-ім склікам».

На ўсе гэтыя «склікі» немцы глядзелі, як на спосаб, каб прыцягнуць беларускую інтэлігенцыю да як найбольшага супрацоўніцтва зь імі, а беларуская інтэлігенцыя, — каб як найбольш вырваць з зубоў акупанта магымасьцяў дзеля абароны беларускага народу ад нацыстаўскага тэрору.

Зь 1-га Ўсебеларускага Кангрэсу нарадзілася Беларуская Народная Рэспубліка — дзяржава, прызнаная «дэ юрэ» 10 сувэрэннымі дзяржавамі сьвету і амаль усімі народамі сьвету «дэ факто». «2-гі Кангрэс» сп. Астроўскага ні аб рэспубліцы, ні аб якойсь іншай, хоць-бы нат дыктатарскай беларускай дзяржаве не пакінуў і ценю. Гаварылася толькі ўсьцяж аб «Цэнтральнай Радзе», змаганьні з бальшавізмам і перамозе гітлераўскай Нямеччыны, а што гэта была за «Рада», якія яна мела правы й якія правы меў ейны прэзыдэнт, дык аб гэтым найлепш гаворыць статут гэтае «Рады», апрацаваны і падпісаны нямецкім генэралам фон Готбэргам: «На чале Беларускай Цэнтральнай Рады стаіць прэзыдэнт, які прызначаецца й звальняецца Генэральным Камісарам. Астатніх сяброў Рады прызначае Генэральны Камісар паводля прадстаўленьня прэзыдэнта» (параграф 4), «Свае распараджэньні й кіраўнічыя пастановы выдае Беларуская Цэнтральная Рада паводля згоды Генэральнага Камісара» (параграф 5).

3-ае пытаньне: Ці магчымая анкета сярод беларускае эміграцыі аб прызнаньні: прэзыдэнта Астроўскага ці прэзыдэнта па тэстамэнту?

Адказ сп. Прэзыдэнта: Немагчымая. Ніводная навет з найбольшых колькасна эміграцыяў у сьвеце такой анкеты не праводзіць, бо такі прэзыдэнт стаўся-б толькі прадстаўніком эміграцыі, а не ўсяго народу.

Сп. Шаўцоў, перабіваючы: Выбачце, я не аб прэзыдэнце, а аб прадстаўніцтве эміграцыі.

Адказ сп. Прэзыдэнта: Ясна, такія выбары магчымыя й яны адбываюцца ўсюды. Вось нядаўна адбыліся выбары ў такое эміграцыйнае прадстаўніцтва беларусаў у Нямеччыне — у Беларускі Нацыянальны Камітэт. Дзіўна толькі, што некаторая частка выбары гэтыя байкатавала і праводзіла такія-ж выбары асобна.

4-ае пытаньне: Што Вы скажеце аб паўнамоцтвах беларусаў для палякаў, аб якіх пісала газэта «Кроніка»?

Адказ сп. Прэзыдэнта: Чыясьці выдумка або правакацыя. Было аб гэтым між іншым спраставаньне ў беларускай прэсе.

5-ае пытаньне: якой Вы думкі аб праграме «Крывічоў»?

Адказ сп. Прэзыдэнта: Калі ходзіць аб якойсь палітычнай праграме «крывічоў», дык ведаю, што такой нідзе няма. А тое, што сяньня зарубежніцкая «прэса» называе «крывічамі» ўсіх беларускіх незалежнікаў, дык гэта толькі ейная выдумка. Ведама, што ў успомненай «прэсе» называюць нат і ўсю Раду БНР «крывіцкай», а ў тым ліку і мяне асабіста, хоць гэтым спадаром добра ведама, што мы ў Францыі, Англіі і таксама ў Нямеччыне супраць якой-колечы замены сяньня нашага нацыянальнага назову, уважаючы гэтую справу не на часе.

Не разумею, чаму з гэтага рабіць аж такую буру! У демакратычным грамадзтве кажны грамадзянін мае права высунуць якісь праект і яго абараняць.

Дзіўлюся толькі, чаму зарубежнікі, будучыя такімі праціўнікамі назову «Крывія», аж гэтак папулярызуюць гэты назоў у прэсе і тым самым найбольш спрычыняюцца да ягонае папулярызацыі.

6-ае пытаньне: Што Вы скажеце аб выступленьні «Бацькаўшчыны» аб «квісьлінгах» і аб правакацыі жаўнераў?

Адказ сп. Прэзыдэнта: Артыкул гэты быў няўмела зрэдагаваны, бо назвалі «квісьлінгаў» агульна, не падаўшы іхных імёнаў.

Гаварыць-жа аб зрадніках свайго народу, не называючы іх па імені — гэта значыць хаваць іх. А той запраўдны зраднік будзе тады першы крычаць і паказваць пальцамі на іншых, ні ў чым не вінаватых, а спасярод тых невінаватых знойдуцца наіўныя, што прыймуць гэта на свой рахунак.

У прынцыпе-ж зраднікаў хаваць ня можна, бо гэтага сорту людзі, як людзі бяз усякай этыкі й маралі, ніколі не пакаяцца, калі ім будуць дароўваць. Караць сяньня нашых зраднікаў мы ня маем ніякае змогі, але выкрываць іх перад сваім грамадзянствам мусім, бо як-жа інакш ад іх адгарадзіцца ў іхнай далейшай злачыннай дзейнасьці.

У беларускім вызвольным руху, як і ў жыцьці ўсіх іншых народаў, заўсёды такіх зраднікаў ізалёўвалі ад свайго грамадзтва, ня гледзячы нат на іхныя папярэднія заслугі. А ў нашым грамадзтве таксама былі і ёсьць такія зраднікі, якія выбралі сабе гэта за прафэсію. Надовячы ён служыў камінтэрну, учора польскаму ваяводу, потым танцаваў, вылазячы із скуры, нямецкім тыранам, а сяньня таксама вылазіць і пачынае зноў старацца пралезьці ў рады беларускіх, менш выробленых палітычна масаў, праводзячы для чыейсь карысьці сваю разбуральную работу. Ці-ж гэта не прафэсыянальна-агентурныя тыпы і ці можна аб іх маўчаць?

Што да «правакацыі» беларускіх жаўнераў, дык, бязумоўна, правакацыя гэтая ёсьць, і то ня толькі жаўнераў. Трэба толькі добра разабрацца, зь якога яна йдзе боку.

Ёсьць, бачыце, група людзей, якія за ўсякую цану хацелі-б бачыць беларускіх жаўнераў у чужым мундзіры, а ў тым ліку і ў мундзіры нямецка-гітлероўскім. Гэтая група людзей, разьлічваючы на палітычную нявыробленасьць некаторых беларусаў, так да іх падходзіць:

Калі вы выракаецеся — кажуць яны — тых, што вам надалі вайсковыя рангі, мусіце, лягічна, вырачыся й сваіх рангаў, а БНР, прыкладам, што ня прызнае аўтарытэту Астроўскага, мусіць, кансэквэнтна, ня прызнаць і вайсковых рангаў, наданых Астроўскім.

Згадзіўшыся з такой «лёгікай», сяньняшняе Задзіночаньне Беларускіх Вэтэранаў мусіла-б адразу разьвязацца, бо такая «лёгіка» забавязвала-б вайскавікоў беларусаў з чырвонае арміі застацца вернымі да сьмерці генэралісімусу Сталіну за наданьне ім афіцэрскіх рангаў, другія польскаму ўраду, трэйція — расейскім манархістым, чацьвертыя, што апынуліся ў розных беларускіх фармацыях, створаных за нямецкай акупацыі, — немцам.

Закідаць, ці лепш угаварваць беларускім вайскоўцам нэтычнасьць і немаральнасьць за «зраду» сваім ранейшым «аўтарытэтам», і **ёсьць правакацыяй**, у якой «зашыфроўваюцца» галоўным чынам дзьве хітрыя ідэйкі: 1. прадставіць сьвету беларускага вайскоўца, як бязідэйнага й бяздушнага манекіна, якога мог-бы ўважаць чуць не за сваю собскасьць той, хто надзеў на яго мундзір, і 2. каб беларускія вайскоўцы прадэманстравалі свае сымпатыі і вернасьць стаўленікам нямецкіх акупантаў.

Такая правакацыя праводзіцца ня толькі ў дачыненьні да вайскоўцаў, але й да цывільных. Гэткія-ж закіды «зрады» з боку прыхільнікаў сп. Астроўскага робяцца і былым сябрам БЦР і ўдзельнікам «2-га кангрэсу». Уявім сабе на хвіліну, што ўсе сябры БЦР і ўдзельнікі гэнага «3-га скліку» прызналі апошні за 2-гі Ўсебеларускі Нацыянальны Кангрэс, як праўнае і свабоднае выяўленьне народнае волі, дык у якой-жа тады ролі выглядалі-б гэныя «дэлегаты» на фоне ўсіх тых пахвалаў і прысягаў вернасьці немцам, высказанымі некаторымі прамоўцамі і ў некаторых дакумэнтах «зьезду»? Прызнаўшы гэны зьезд праўным і свабодным, мусілі-б мы тады кансэквэнтна прызнаваць, што беларускі народ у цэлым ня толькі апрабаваў акупацыйную палітыку немцаў у Беларусі з усімі іхнымі дзікімі актамі тэрору, а нат захапляўся ёй. І ці-ж гэта не ёсьць таксама правакацыя?

(Заканчэньне будзе).

Зь Беларускага Жыцьця

У ЖАНОЦКІМ ЗГУРТАВАНЬНІ Ў ОСТЭРГОФЭНЕ

У Жаноцкім Згуртаваньні ў Остэргофэне праца разгортваецца што раз шырэй. Зь ініцыятарак паасобных імпрэзаў і сьвяткаваньняў, якія мелі месца ў лягеры, як калядняя ялінка, сьвята маці, гадавіна сьмерці Янкі Купалы, вырасьлі ўзапраўды нязгоршыя, нацыянальна паўнавартасныя й сьведамыя сваіх заданьняў кадры жаноцкай арганізацыі. І працуе гэтая група жанчын зацята й упорыста. Нічога, што ня раз бываюць перашкоды на шляху, нічога, што зь недаверам ня раз пазіралі мужчыны на гэтую працу. Яны паступова пераконваюць іх не пустымі славамі, але вынікамі вось гэтай грамадзкай працы.

Існуе ў Згуртаваньні некалькі сэкцыяў. А вось як выглядае праца, напрыклад, аднэй зь іх — сэкцыі харытатыўнай. Сэкцыя гэтая зрабіла падчас зьезду Беларускага Нацыянальнага Камітэту 24.4.48 зборку грошаў на дапамогу хврым, якая дала 1300 марак, зборку прадуктаў у лягеры Остэргофэн. Паслала некалькі пачкоў беларускім вязьням і 14 пачкоў хворым на сухоты ў санаторыі й шпіталі. У гэтым яшчэ месяцы будуць ізноў высланыя пачкі вязьням і хворым нашага лягеру, што знаходзяцца ў шпіталях. Згуртаваньне ўжо атрымала шмат лістоў з падзякамі за дапамогу й апеку.

Каб здабыць патрэбныя сродкі, сэкцыя імпрэзаў зарганізавала лятарэю на танцавальнай вечарыне, ладжанай Жаноцкім Згуртаваньнем 28 жніўня, якая дала чыстага даходу 122 маркі. Ініцыятыва й правядзеньне ў жыцьцё гэтае імпрэзы была заслугай кіраўнічкі сэкцыі імпрэзаў сяброўкі М. Урад Згуртаваньня правёў зборку цыгарэт ад працуючых лягеру з вынікам 38 пачак.

Сяброўкі Згуртаваньня заўсёды й самі ахвотна складаюцца, каб дапамагчы тым, што патрабуюць. І гэта робяць так шчыра й самаахвярна, што хацелася-б тут спэцыяльнаа падчыркнуць добрую волю, а дакладней добрае сэрца нашых сябровак у сяньняшні такі зматарыялізаваны час.

Падзякай ім за гэта няхай будуць словы зь лісту аднаго хворага: «Калі прачытаў я на пачцы, хто яе мне выслаў, дык хацелася Вам ручкі цалаваць за Вашую дабрату, мілыя сябровачкі! Няхай Усемагутны помніць Вам гэта!».

Так, рабіць дабро — вялікая хрысьціянская дабрадзейнасьць. І будзе йсьці гэтым хрысьціянскім шляхам беларуская жанчына супольна із сваімі сёстрамі ў сваей арганізацыі, бо яна ўжо ведае, што ў грамадзе сіла.

Сьветка.

СУПРАЦЬ СЬЦЯГАТАПТАЛЬНІКАЎ

Беларуская моладзь!

Доўга йшла праз акіян да Аргентыны сумная для нас беларусаў вестка аб зьняважэньні варожымі элемэнтамі беларускаму вызвольнаму руху нашых нацыянальных сьцягаў пры ўнесяньні іх у праваслаўную царкву ў Міхэльсдорфе ў дзень Сьв. Юр'я.

Галоўная Ўправа, Наглядная Рада й актыў Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне на супольным паседжаньні выражае свае глыбокія спачуваньні, запэўняючы, што яно ў той дзень, так сяньня, як і заўсёды будзе з вамі бараніць беларускага сьцягу, — сымбаль нашага змаганьня за вольнасьць і незалежнасьць Бацькаўшчыны. Беларускі сьцяг гэта сьвятасьць нашага Народу, яго павінен бараніць кажны беларус і аддаць яму заўсёды й усюды належны гонар, дзе-б ён ня быў і хто-б яго ня нёс.

Ня толькі гэты ўчынак, але й апраўдваньне яго мы уважаем за найвялікшы праступак супраць нашых сьвятых ідэяў, за якія змагаецца ўвесь беларускі народ, — на гэта няма апраўданьня й прабачэньня.

Беларуская Моладзь! Ваш паступак мы поўнасьцю адабраем і ганарымся тым, што ён паказаў сьвету сілу, дух і мараль нашай моладзі, якая ажыцьцявіць гэты ідэал, што быў патоптаны разам із сьцягам людзьмі заражанымі варожымі для беларускага Народу ідэямі, бязь ніякай маралі, бязь ніякага нацыянальнага пачуцьця.

Хай Жыве Беларуская Моладзь!

Хай Жыве Вольная й Незалежная Беларусь!

Па даручэньні прысутных па паседжаньні падпісалі:

Старшыня ЗБА К. Мерляк.
Заст. Старшыні М. Ланкэвіч.
Сакратар М. Каленік.

Буэнос-Айрэс, 8.8.1948.

ВЕРЫМ І ДАПНЁМ

Апошнія часы тут на эміграцыі рассылаецца па беларускіх селішчах даволі вялікая колькасьць ратарскіх лістовак у беларускай мове.

Гэта нармальна была-б пацяшаючая зьява, каб у лістоўках што колечы было карыснае й пазытыўнае для нашае грамадзкасьці. На вялікі жаль, лістоўкі, ад пачатку й да канца, перапоўнены толькі усялякімі брыдотамі, лаянкамі, а нярэдка й выдуманымі даносамі.

Чытаючы гэта і асабіста ведаючы некаторых з гэтых рэдактараў лістовак, насоўваецца думка, што людзі ня ведаюць, што робяць. Ня хочацца верыць, каб гэта пісалі злачынцы ці вырадкі нашага народу*) Нельга ўявіць сабе, каб сьведамы й чэсны беларус спэцыяльна шукаў і выносіў на публічную арэну ўсялякія бруды, паказваў на дзённы сьвет найгоршае і стараўся пасеіць нязгоду й разыходжаньне ў прынцыпах нашага незалежніцкага шляху, а гэтым — даць повад ворагам талкаваць, што мы яшчэ не дарасьлі да самастойнага дзяржаўнага жыцьця. Яны-ж не ўяўляюць сабе ці ня хочуць бачыць, што краіна нашая й народ увесь знаходзяцца дасюль у ваковах найцяжэйшае няволі. Стараюцца адвярнуць увагу ад таго, што ад волі й працы арганізаванага народу залежыць дабро ўсіх нас і Бацькаўшчыны, а сіляцца знайсьці нейкіх апякуноў, ад волі каторых быццам залежыць нашая доля, і пад іхнюю апеку радзяць аддацца, хаваючыся за чужыя шырокія ці выпешчаныя плечы. Гэтыя бязьдзейнікі, каб застанавіцца над сабою і ўзяцца за працу, шукаюць толькі прычыны і няважныя памылкі раздуваюць, абвінавачваючы навет у праступнасьці тых, каторыя, не пакладаючы рук, працуюць. Значная колькасьць гэтых «дзеячоў», каб народ не даведаўся аб іхнім асабістым жыцьці й бязьдзельлі, пахаваліся на прыватныя памешканьні або іншанацыянальныя лягеры, адкуль бесьпячней шкодзіць і ладзіць тайныя нарады. Яны інсцэнізуюць нейкія зусім «дэмакратычныя» выбары па падпісных лістох, ладзяць зьезды тайна ў чужых лягерах, фабрыкуюць бойкі й зьняважэньне сьвятыняў, стараюцца ~~пасеяць нязгоду й ненавісьць~~ паміж праваўслаўнымі й каталікамі. Гэта ўсё робчцца, каб стэрыразаваць і скампрамітаваць беларусаў у вачох акупацыйных уладаў і змусіць людзей, чэсна й аддана працуючых для дабра нашага народу, пакінуць працу. Вынік гэтага такі, што невялікая частка нашага нясьведамага грамадзтва пачынае хістацца, але ніводзін з актыўных, не ад сяньня толькі, нашых дзеячоў не пашатнуўся, не адыйшоў ад прынятае цяжкое й адказнае працы на карысьць агульную і не адыйдзе. Мы ўжо перанесьлі й пражылі многае, перанесьлі зьдзек палякаў і глум расейцаў, чырвоных і другіх; не адзін з нас адведаў турмы й ссылкі, у той час, калі гэтыя «дзеячы» засядалі на мягкіх крэслах і дапамагалі чужынцам нішчыць духова й фізычна наш народ. Ім ня вэрыцца, што мы здабудзем сваю поўную незалежнасьць, яны сьняць сны аб мінулых цёплых месцах камісарыятаў ці ваяводзтваў, калі ім у пояс кланяўся зьнясілены духова й маральна беларус. Але гэтыя іхныя сны й астануцца снамі. Мы верым і ўпэўнены, што нашая Бацькаўшчына вызваліцца зь няволі і наш народ зажыве свабодна й згодна на сваёй зямельцы. Верым, што нашая эміграцыя, добра ўяўляючы сабе ролю, якую ёй лёс прызначыў — палітычнага эмігранта і рэпрэзэнтанта ўсяго беларускага народу, ніколі за гэтымі авантурыстымі ня пойдзе, а ашуканыя вернуцца на адзіны шлях поўнае незалежнасьці Беларусі.

Гэтая вера ў народны здаровы розум і ў імкненьне да вольнасьці бязь ніякіх апякуноў, ў народную сілу да здабыцьця гэтае волі накладвае абавязак на ўсіх чэсных сьведамых беларусаў незалежнікаў, каб з пабольшанаю энэргіяю й вытрываласьцю працаваць і змагацца для дасягненьня найвышэйшага ідэалу, якім ёсьць незалежная Беларусь, дзе кажны знойдзе сабе належнае месца, працу й мецімс, без нічые ласкі, хлеб і ўсё патрэбнае. Да гэтае працы вернуцца, пазнаўшы свае памылкі, і тыя, каторыя гэтаму сёньня ня вераць ці пайшлі за чужынцамі

Прасякнутыя гэтаю вераю мы жывём, працуем, змагаемся і пераможам.

Я. Асімовіч.

*) З сумам трэба прызнацца, што гэта робяць людзі па паходжаньню беларусы, каторыя ніколі не авансаваліся на актыўных беларускіх адраджэнцаў. — **Рэд.**

СКАЎЦКІ КУРС ДЛЯ КІРАЎНІКОЎ ДРУЖЫНАЎ

7 верасьня распачаўся скаўцкі курс для дружыновых у беларускім лягеры Остэргофэн. Курс меў ахапіць кандыдатаў з усіх беларускіх асяродкаў амэрыканскай і брытанскай зонаў, але ў сувязі з пануючай у некаторых лягерах эпідэміяй дзіцячага паралюшу прымушаны быў абмяжавацца да ўдзельнікаў зь лягеру Майнлеўс і Остэргофэн. Курс наведвае 16 хлопцаў і дзяўчатаў і трываць будзе да 13 верасьня 1948 г. Падобны курс мае адбыцца пасьля гэтага тэрміну ў Міхэльсдорфе для кандыдатаў тамашняга лягеру й Віндзішбэргэрдорфу.

Вышаў з друку
«САКАВІК»
№ 2 (3) за 1948 г.

У нумары: вершы Алеся Салаўя, Рыгора Крушыны, Натальлі Арсеньневае, Уладзімера Клішэвіча, Масея Сяднёва, проза Максіма Багдановіча, Ніны Змагаркі, С. Юстапчыка, Сьвітазянкі, артыкулы У. Глыбіннага, проф. др. А. Бэра, С. Д., таксама пераклады вершаў М. Багдановіча панямецку.

Цана 1 м. 20 фэн.

Выпісваць праз адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Беларускага Нацыянальнага Камітэту

Беларускі Нацыянальны Камітэт — Цэнтральнае Прадстаўніцтва Беларускае Эміграцыі ў Нямеччыне з дазволу Галоўнае Кватэры ІРО ў Бад Кісінгэн прыступае да выдаваньня беларусам у Нямеччыне спэцыяльных пасьветчаньняў з фатаграфіямі аб іхнай беларускай нацыянальнай прыналежнасьці.

У сувязі з тым, што дагэтуль было многа недаразуменьняў у ўстанаўленьні нацыянальнасьці й многія беларусы падчас рэгістрацыяў ІРО былі паміма сваей волі запісаныя іншымі нацыянальнасьцямі, і наадварот— некаторыя небеларусы з розных прычынаў падавалі сябе беларусамі, такія пасьветчаньні значна дапамогуць уладам ІРО і эміграцыйным камісіям у дакладным устанаўленьні нацыянальнай прыналежнасьці нашых суродзічаў, а таксама беларускім арганізацыям паза межамі Нямеччыны ў вапецы над нашымі суродзічамі, што выэмігруюць у дадзеныя краіны.

Дзеля атрыманьня гэтых пасьветчаньняў неабходна зьвяртацца да зонных камітэтаў і ўпаўнамочаных імі людзей на мясцох, падаючы аб сабе наступныя дадзеныя: Імя й прозьвішча (так, як у асабовым дакумэнце), чысло й месца нараджэньня, прафэсія, месца жыхарства. Посьле перасланьня іменных сьпіскаў з гэтымі дадзенымі й з залучанай аднэй фатаграфіяй, БНК будзе выстаўляць гэтыя пасьветчаньні.

Аплата за пасьветчаньне — 1 н. марка.

Дзеці ніжэй 18 год атрымліваць такіх пасьветчаньняў ня будуць.

Прэзыдыюм БНК.

Остэргофэн, 1 верасьня 1948 г.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Беларускага Нацыянальнага Камітэту

1. БНК паведамляе, што на яго адрас прысланы дазвол Аргентынскага Ураду для 99 беларусаў на ўезд у Аргентыну. У спісак уключаныя тыя беларусы, якія ў траўні 1948 г. праз Цэнтральны, Зонныя й мясцовыя Камітэты пераслалі анкеты ў Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне на падставе паведамленьня БНК. («Бацькаўшчына» № 16(19) — 16.5.1946 г.).

У сувязі з тым, што некаторыя анкеты былі высланыя беспасярэдна праз мясцовыя й зонныя камітэты ў Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне й што ў прысланым дазволе не ўказаныя адрасы зацікаўленых, БНК ветліва просіць Зонныя й мясцовыя Камітэты копіі гэных сьпіскаў, высланых раней у З. В. А., прыслаць у БНК да дня 20.9.48.

Далейшыя ўказаньні афармленьня выезду ў Аргентыну будуць перасланыя зацікаўленым пасьля атрыманьня іх адрасоў.

Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне паведамляе, што пазьней атрыманыя сьпіскі будуць у бліжэйшым часе зацьверджаныя аргентынскім урадам і перасланы на адрас БНК.

2. Перасыланьне анкетаў у Аргентыну праводзіцца й у далейшым праз БНК за пасярэдніцтвам Зонных Камітэтаў. Анкеты, высланыя другой дарогай, ня будуць прызнаныя Згуртаваньнем Беларусаў у Аргентыне.

3. Пры гэтым БНК заклікае ўсіх беларусаў выраўняць залегласці нацыянальнага ападаткаваньня.

4. БНК пачаў выдаваць пасьветчаньні з фатаграфіяй аб нацыянальнай прыналежнасьці.

Прэзыдыюм БНК.

ШУКАЮЦЬ . . .

Кошт абвесткі — па дзесяць фэнігаў за кажнае асобнае слова. Аплата наперад.

Брата **Квяткоўскага Аляксандра** і знаёмых з Слонімшчыны — Квяткоўскі Юрка.

Сына **Мікалая Гляцэвіча** нар. 1925 г., што адлучыўся ад сям'і ў лягеры Граева ў 1944 г. — бацькі Эмільян і Зофія Гляцэвічы.

Жонку й сына — Антановіч Антон.

Салохіна Рамана, нар. 15.7.1923 — Салохін Міхаіл.

Брата **Грыцука Мікалая** — Гуз Павел з маткай Варвараю й братам Шурам (Аўстрыя).

Паўла Вабішчэвіча — родны брат Даніла зь вёскі Рубель, Палесьсе.

Весткі просім прысылаць на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Whiteruthenian Weekly „The Fatherland"

Autorized by EUCO M Hq. Civil Affairs. Division 20 July 48, Nr. UNDP 225. Circulation 3500 copies.

Administration — (13b) Osterhofen, Ndby., Whiteruthenian. D. P. Camp.

Edited by: Whiteruthenian National Committee.

Printed by: Georg Jakob, München 8, Pütrichstraße 3a.